Болбас, В. С. Маральна-выхаваўчы патэнцыял спадчыны Міколы Гусоўскага / В. С. Болбас // Беларуская літаратура : рэспубліканскі міжведамасны зборнік / Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт ; рэдкалегія: І. Ф. Штэйнер (галоўны рэдактар) [і інш.]. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – С. 10–20.

# МАРАЛЬНА-ВЫХАВАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ СПАДЧЫНЫ МІКОЛЫ ГУСОЎСКАГА

Шырокі культурна-асветніцкі рух, які набраў асаблівую моц на беларускіх землях да XVI ст. як дзецішча эпохі Адраджэння, меў ярка выражаны маральна-этычны кірунак, што, прынамсі, было характэрна і для іншых краін, у той ці іншай ступені закранутых рэнесанснымі плынямі. Але для культуры Беларусі гэтыя павевы мелі пэўны рэзанансны характар, бо яны накладваліся на грамадскую думку народа, якой яшчэ з часоў Кіеўскай Русі былі ўласцівы пераважна этычныя падыходы ў пошуках дасканалай арганізацыі грамадскага быцця. Таму не было, бадай, ніводнага айчыннага мысліцеля той эпохі, які б абыходзіў гэтыя пытанні. Не мог абмінуць іх і адзін з карыфеяў нацыянальнага адраджэння, сучаснік Францыска Скарыны Мікола Гусоўскі.

Пасля таго як у станоўчы бок было вырашана пытанне, лічыць ці не яго лацінамоўную спадчыну нацыянальным здабыткам, не толькі гісторыя беларускай літаратуры папоўнілася зоркай першай велічыні, але новымі гранямі заззялі веліч старажытнага народа, глыбіня яго дум і пафас "вячыстых спраў". Пры відавочнай рознабаковасці творчасці паэта дамінуючым у ѐй з'яўляецца ўсѐ-такі грамадзянска-маральны аспект. Амаль кожны вершаваны радок яго твораў прасякнуты высокім этычным пачаткам.

Трэба зазначыць, што пры пэўнай увазе даследчыкаў да гэтага боку літаратурнай дзейнасці Гусоўскага пакуль што ў адзначаным кірунку няма, на жаль, прац абагульняючага характару. Чамусьці аналіз спадчыны паэта грунтуецца, як правіла, на адным з яго твораў, пераважна на сусветна вядомым шэдэўры – "Песні пра зубра". Пры такім падыходзе не могуць быць вырашаны пытанні не толькі раскрыцця паўнаты поглядаў паэта, але і іх дакладнасці.

Галоўнай заслугай Гусоўскага было смелае ўвядзенне ў этычныя пошукі свецкіх пачаткаў. Прытрымліваючыся скарынінскай думкі аб неабходнасці арыентацыі людзей на рэальнасці "сегосветного жнтня", Гусоўскі паглыбляе ідэі першадрукара аб залежнасці ўладкаванасці зямнога жыцця ад самога чалавека. Блізкая сувязь з простым людам дазволіла мысліцелю больш цесна, у параўнанні са Скарынам, звязаць маральна-этычныя пытанні са штодзѐнным жыццѐм, узбагаціўшы іх элементамі рэчаіснасці, надаць відавочнае канкрэтна-практычнае гучанне. Не чакаючы дапамогі звышнатуральных сіл, кожны індывід згодна сваіх поглядаў можа і нават павінен яшчэ на зямлі ўдасканальваць сваю прыроду. У першую чаргу гэта тычылася яе духоўнай часткі.

Узвялічваючы чалавека, яго розум і здольнасці, Гусоўскі на першы план вылучае сілу і красу чалавечага духу. Асноватворным можна лічыць падыход паэта да вызначэння вынікаў маральнага выхавання, які ѐн сфармуляваў шырока вядомымі сѐння словамі: "Дзяржава абапіраецца больш на мужнасць духу, чым на сілу цела"[1]. Прытрымліваючыся сучаснага лексікону, можна сказаць, што духоўнасць у яго з'яўляецца ідэальным палівам рухавіка гісторыі. Гэтую ж думку ѐн падкрэсліў і ў іншым месцы:

Княжанне Вітаўта лічаць усе летапісцы
Росквітам княства Літоўскага, нашага краю,
І называюць той век залатым. Разбяромся.
Мне так здаецца, шіо гэтай шаноўнаю назвай
Век той названы па простай прычыне: дзяржаўца
Перад багаццем і шчасцем зямным пастаянна
Ставіў багацце духоўнае – злата дзяржавы. (104)

Як бачна, і шчасце, і слава з'яўляюцца ў яго вынікам высокай духоўнасці. У сістэме духоўных каштоўнасцей адной з найважнейшых з'яўляецца праблема сэнсу чалавечага жыцця. Ад падыходаў асобы да разумення і вырашэння для сябе гэтай праблемы залежыць яе маральна-этычная пазіцыя і лінія паводзін у жыцці. Задумваючыся над сэнсам чалавечага існавання, паэт прыходзіць да высновы, што чалавек – галоўнае тварэнне бога і спрадвечна ў свеце ўсѐ арганізавана такім чынам, каб шчаслівым быў кожны індывід. "Няма нічога на зямлі, каб не створана было дзеля шчасця... – пісаў Гусоўскі, – усім чалавек цешыцца, усѐ яму карысць прыносіць..."[2]

У гэтых радках яўна чуюцца ноткі канцэптуальных палажэнняў эпікурэйскай этыкі аб імкненні кожнай асобы да асалоды. Аднак Гусоўскі не замыкаецца ў вузкаутылітарных, геданістычных падыходах пры вызначэнні сэнсу жыцця. Уся яго творчасць прасякнута думкай аб неабходнасці арыентацыі індывіда да агульнага дабра. Толькі заслугамі перад грамадствам чалавек можа ўвекавечыць сваѐ імя. Пачуццѐ абавязку перад людзьмі як адзін з асноўных крытэрыяў маральнасці – скразны лейтматыў усѐй літаратурнай спадчыны беларускага паэта. Ён не раз звяртаецца да гэтага пачуцця зямных уладароў, заклікаючы іх дапамагчы ў паляпшэнні сацыяльна-маральнай уладкаванасці грамадства. Непадзельным гневам напоўнены радкі яго твораў:

"Пастырам будзь па-над паствай", – гаворыць пісанне.
Будуць – чакайце! Ваўкамі грызуць сваю паству.
Вось да чаго давяла непамысная прагнасць
Славы, багацця і ўлады, і як ачарсцвілі
Усѐ іх нутро сябелюбства, раскоша і слава! (116)

Вытокі многіх бед бачыць Гусоўскі ў тым, што не захоўваюцца маральныя законы, выпрацаваныя продкамі. Паэт раіць: "Лепш захаваў бы народ

непарушна ў душы векавечна тое, што наказвалі сцерагчы... нашы продкі"[3]. На яго думку, духоўна-маральнае ўдасканальванне грамадства дапамагло б не дапусціць татарскага і турэцкага нашэсцяў на Еўропу, перамагчы чуму ў Рыме і здзейсніць многія іншыя цудадзействы, якія людзі чакаюць звонку. Назіранні за паўсядзѐнным жыццѐм простых людзей даюць яму падставу лічыць, што ў рэшце рэшт чалавек сам з'яўляецца творцай свайго шчасця, бо "... сваімі ж рукамі трымае дзіду ці лук ды і лѐс" (84).

Гусоўскі задумваецца над вытокамі невысокага ўзроўню маральнасці ў грамадстве, нетрываласці веры. Нават Хрыстос, якога бог паслаў для ўратавання людзей, "...усѐ ж не змог навесці на праведны шлях павучаннем"[4]. Адну з прычын такой няўдачы паэт лічыць адсутнасць адчувальна-бачнай мэты: "Верылі людзі, але чакалі, ці ж з'явіцца мэта, ці ж можна будзе прычыны ўбачыць"[5]. Такім чынам, Гусоўскага ўжо не задавальняюць імператыўна-маральныя прадпісанні, характэрныя для сярэднявечча. Ён спрабуе шукаць прычыны і пабуджальныя матывы маральных паводзін людзей. Таму Гусоўскі імкнецца ў якасці выхаваўчай мэты стварыць ідэальны вобраз як прадстаўніка асобных саслоўяў, так і чалавека наогул. Узорам дзяржаўнага мужа, кіраўніка і выхавацеля выступае князь Вітаўт, якога паэт малюе як многабакова развітую асобу. Ён надзяляе князя шэрагам дабрачыннасцей, такіх як разумнасць, высакароднасць, справядлівасць, патрабавальнасць, ваяўнічасць, суровасць, нявычварнасць, чуласць да падначаленых і інш.

У жаданні падкрэсліць прыярытэтную ролю выхавання ў станаўленні асобы паэт паказвае Вітаўта не на ратным полі, а ў паўсядзѐннай, вайскова-падрыхтоўчай і выхаваўчай дзейнасці. Менавіта тут фарміраваліся карані будучай славы, здабыткі якой пажыналіся ў ваенных паходах. Аддаючы належнае ролі аўтарытэту выхавацеля, Гусоўскі асобна адзначае, што адна з заслуг князя заключаецца ў тым, што ѐн даваў магчымасць праявіць сябе кожнай асобе. Заахвочваючы падданых на дабрадзейныя ўчынкі, Вітаўт садзейнічаў таму, што дабіўся "найвысшага ўздыму Княства Вялікалітоўскага" (94). Характэрна, што пры стварэнні ідэальнага вобраза, за аснову якога быў узяты герой нацыянальнай гісторыі, паэт парушыў традыцыю рэнесансных мысліцеляў, якія прататыпаў сваіх ідэалаў бралі у сюжэтах антычных ці біблейскіх міфаў. Дарэчы, Гусоўскі быў з кагорты тых, хто распачаў усталяванне традыцый нацыянальнай рэнесансна-гуманістычнай думкі. Прычым паэт дэманстраваў творчы падыход да выкарыстання антычнасці.

Даследчыкі адзначаюць, што Гусоўскі ў сваѐй паэме ачалавечвае зубра, надзяляе яго душой, гонарам, сумленнем. Вобраз ляснога волата як увасабленне сілы, мужнасці, высакароднасці быццам дапаўняе асобныя якасці ідэалізаванага князя. Працяг стварэння маральнага ідэалу наглядаецца ў персанажах простых людзьй – кемлівых, спрытных, смелых, адданых сваѐй радзіме. Чалавекалюбства, якое ўздымаецца да самаахвяравання ў імя людзей, уносіць у сінтэтычны ідэальны вобраз фігуры Іакінфа з аднайменнай паэмы. Завяршае

гэту галерэю партрэт аўтара, лірычнага героя паэмы "Песня пра зубра", які ўяўляе сабой высокаадукаванага, гуманістычна выхаванага, дэмакратычна настроенага чалавека, патрыёта сваёй радзімы і свайго народа. Выпісаны такім чынам мастацкі вобраз ідэальнай асобы ўвабраў у сябе шырокую палітру агульна-чалавечых вартасна-маральных адносін да свету, увасобіў этыку грамадзянскага служэння народу, пошукі шляхоў выхаду з духоўнага застою і маральнага выраджэння.

Паказваючы людзям узор дасканаласці, гуманіст мастацкімі сродкамі паралельна раскрывае сістэму якасцей, якія павінны быць у кожнага чалавека. Класічныя катэгорыі этыкі – дабро, справядлівасць, абавязак, сумленне, гонар, годнасць, шчасце – скандэнсаваны і арганічна ўплецены ў канву мастацкай спадчыны паэта. Ён лічыць, што "пачатак пачаткаў сэнсу жыцця і пачуцця святога – радзіма" (112). Наканаваннем лёсу закінуты ў Рым – калыску гуманізму, адчуваючы на сабе дзейсны ўплыў італьянскага Адраджэння, ён праяўляе такое абвостранае пачуццё любві да Айчыны і нацыянальнай гордасці, якое зусім неўласціва рэнесансна-гуманістычнай еўрапейскай думцы. Пампезнасць "вечнага горада" не змагла выцесніць з сэрца і памяці краявіды родных мясцін. "Думкай ляціш быстракрылай ноччу і днём на радзіму, – пісаў Гусоўскі, – у памяці сеці вабіш той час незабыўны, што некалі ў нетрах родных лясоў разгубіўся, і кліч – не даклічаш..." (60)

Многія героі твораў Гусоўскага набываюць маральную прывабнасць за падобную замілаванасць да роднай зямлі, якая ўсямерна ўсхваляецца паэтам. Невыпадкова яго творы выяўляюць сацыяльныя сімпатыі і мастацкую схільнасць патрыёта да простых людзей, хоць і паказаць гэта адкрыта з прычыны гістарычных умоў і традыцый ён мог не заўсёды. Імкнучыся выхаваць пачуццё любві, павагі і спачування да абяздоленых людзей, Гусоўскі паказвае іх веліч і ў той жа час гаротнае становішча з-за таго, што "... князь і баяры – усе, каму льга заступіцца, глухі да нас і не горай, чым жорсткі татарын, душаць пятлёй галасы абурэння ў народзе" (118). Любоў да роднага народа не выклікала ў яго аніякага сумнення адносна годнасці людзей іншых нацыянальнасцей, а наадварот. Ён, напрыклад, прыходзіць да вываду аб неабходнасці аб'яднання ўсіх хрысціян для барацьбы з турэцка-татарскай агрэсіяй. Ва ўсёй глыбін і паўнаце Гусоўскі раскрыў аблічча народнасці, якая насяляе "край загадак і цудаў". Суперажыванне з народам, няведанне выйсця з жахлівага становішча выліваецца к фіналу паэмы ў роспачны крык душы – зварот да святой дзевы Марыі з надзеяй "вымаліць краю... абарону – спагаду" (119).

Адметна, што ў Гусоўскага патрыятызм – гэта адна з маральных якасцей, якая не залежыць ад саслоўнай прыналежнасці яго носьбіта. Наогул, у маральных поглядах паэта выразна прасочваецца спроба аддзяліць высакароднасць ад высакароднага паходжання. На яго думку, такія рысы характару, як справядлівасць, мужнасць, вернасць і іншыя, могуць і павінны быць у кожнага чалавека незалежна ад яго класава-саслоўнага паходжання. Так,

напрыклад, годнасць можа быць здабыта толькі самім чалавекам, а не атрымана ў спадчыну. На жаль, у жыцці бываюць "прычынаю часта кроўныя сувязі, калі нявартых узносяць на пасаду: няма ў такіх дабрачыннасці, бачаць карысць у кожнай справе"[6]. Калі апекуна Гусоўскага буйнога палітычнага і грамадскага дзеяча Эразма Вітэлюса папракалі нязнатнасцю роду, паэт яго супакойваў: "Імя табе ж здабылі годнасць, доблесная праца"[7]. Не саромеецца, не тоіць Гусоўскі і свайго простага паходжання. Сцвярджаючы годнасць кожнага чалавека, ѐн, сын "простага палясоўшчыка", смела ўводзіць сваѐ "я" ў сюжэт ліра-эпічнай паэмы, тактоўна, але з пачуццѐм уласнай годнасці пярэчыць антычным аўтарытэтам.

Важнейшай задачай маральнага выхавання, лічыць Гусоўскі, з'яўляецца фарміраванне ў чалавеку калектывісцкіх пачаткаў. Ён паказвае перавагі сумеснага ладу жыцця перад адзіночным на прыкладзе зубрынага статка. Магутнасць зубра памяншаецца мнагакратна, як толькі ѐн адаб'ецца ад сародзічаў. Таксама і ў людзей – "чалавек у адзіночку не ведае сваіх пераваг"[8]. З другога боку, калектыўнае жыццѐ само з'яўляецца дзейсным сродкам выхавання. Толькі з дапамогай грамадства індывід можа дасягнуць маральных вышынь, "бо лепш праявіцца ў масе" (97). Адной з неабходных умоў маральнага здароўя грамадства Гусоўскі лічыць свабоду, укладваючы ў гэта паняцце даволі шырокі для свайго часу сэнс. Сфарміраваны на бязмежных прыродных прасторах, характар паэта ўсталѐўваў у ім пачуцці фізічнай і духоўнай незалежнасці. Пушча не раз дэманстравала, што "перад законам і правам лясным на здабытак – роўныя ўсе там" (72). І хаця, згодна з хрысціянскімі ідэаламі, ѐн выразна паказвае межы такой свабоды, якая залежыць ад становішча ў грамадстве і прыродных абставін, гарызонты яе ўжывання расхінуты настолькі, што даюць магчымасць кожнаму чалавеку дзейнічаць згодна ўнутраных законаў розуму і сумлення. У даслоўным перакладзе з лацінскай мовы гэтая думка гучыць так: "Вышэйшы сторaж індывідуальнага жыцця заўсѐды ўнутры нас" (Maksima inest tantum propriae custodia vitae) (15).

Як і ў іншых рэнесансных дзеячаў, якія падпарадкоўвалі свае погляды дыдактычна-маралізатарскай тэндэнцыі, у Гусоўскага маральная сістэма будуецца на розуме і мудрасці. Асновай маральнага развіцця асобы ѐн лічыць веды. Прычым у адрозненне ад іншых айчынных і замежных гуманістаў беларускі мысліцель уносіць свае істотныя дапаўненні ў разуменне інтэлектуальна-асветніцкіх каштоўнасцей. Нікольки не прыніжаючы кніжныя веды, бо сам "свет даўніны вывучаў... па кнігах славянскіх, граматах рускіх, кірыліцай пісаных вязкай" (59), асветнік лічыць неабходным узгадняць і звяраць іх з жыццѐвым вопытам. Адрыў тэарэтычных вышукаў ад жыцця можа прывесці да сур'ѐзных памылак ці наогул не дасць ніякіх вынікаў. Сын паляўнічага, які не раз увачавідкі бачыў і паляваў на зубра, прачытаўшы пра яго ў літаратуры, падмеціў: "Дзіўна, што ў кнігах апісаны ѐн не дакладна" (58). Для вучоных-кніжнікаў "пушча – загадка", і Гусоўскі папярэджвае, што адказы на многія пытанні "вы не знойдзеце ў кнігах", а вось ѐн, "лясны чалавек", ведае ісціну, бо

"разгадка хаваецца ў лесе" (60).

Патрыятычная накіраванасць маральнасці, якая будуецца на інтэлектуальнай аснове, патрабуе дзейснай, актыўнай жыццѐвай пазіцыі чалавека, і Гусоўскі бачыць у гэтым важнейшы прынцып маральнага выхавання. Само жыццѐ падштурхоўвае да гэтага таму, што "пад сонцам ніводнай хвіліны без барацьбы не было і не будзе" (68). Вось чаму свой "мазолісты" вопыт, паляванне, пераадольванне цяжкасцей мысліцель разглядае як эфектыўныя сродкі фарміравання духоўнасці. Ён высока цэніць выхаваўчае значэнне лагераў, арганізаваных Вітаўтам, дзе чалавек гартуецца маральна і фізічна. Характэрна, што з дапамогай спецыяльных практыкаванняў, аказваецца, можна, выхаваць у чалавека розныя маральныя якасці, пазбавіцца ад адмоўных і ўдасканаліць станоўчыя. Гусоўскі адзначае, што фізічная – трэніроўка умова духоўнага развіцця – і маральная загартоўка не толькі спрыяюць фізічнаму станаўленню, а, наадварот, могуць каштаваць нават фізіялагічнага жыцця. Так, маральна не падрыхтаваны Лаўрын быў "страхам забіты, знянацку сустрэўшыся з зубрам" (88). Ідэйная, духоўная загартоўка, па перакананню паэта, важней любой зброі, надзейны шчыт ад любых жыццѐвых пераплѐтаў.

Дзейсныя падыходы распрацоўваў паэт і да разумення ролі працы ў жыцці чалавека. Гусоўскі найважнейшым вынікам дзейнасці Вітаўта лічыў тое, што "густа ѐн справамі век насяліў свой" (100). Спагадлівасць героя да людзей, яго маральнасць правяраецца перш за ўсѐ накіраванасцю канкрэтнай дзейнасці. Прайшоўшы ў сваім жыцці прыродна-працоўную школу, Гусоўскі высока ставіўся да працы не толькі як да крыніцы існавання, а добра разумеў яе выхаваўчыя магчымасці. Ён усхваляе багатых і знатных людзей, якія хоць зрэдку, але займаюцца фізічнай працай нароўні з падначаленымі. Таму і матэрыяльныя даброты, багацце, дастатак, набытыя сумленным шляхам, неабходны для зямнога шчасця чалавеку, хаця ѐн супраць іх дэфармуючага ўздзеяння на маральнасць асобы.

Важнай, на наш погляд, асаблівасцю ідэй маральнага выхавання, узнятых Гусоўскім, з'яўляецца тое, што ім амаль не ўласцівы адметны для таго часу забарончы характар. На думку паэта, задача заключаецца не столькі ў тым, каб засцерагчы чалавека ад дрэннага ўплыву, колькі ў тым, каб выхаваць станоўчыя рысы і якасці асобы. У неназойлівай, далѐкай імператыўна-ўстаноўчай накіраванасці форме паэт пераканаўча і аргументавана спрабуе ўказаць шляхі і спосабы станаўлення духоўнага свету чалавека. Разумеючы, што цяжка адразу выхаваць у асобе ўсе дабрачынныя якасці, ѐн выступае за карпатлівасць і паэтапнасць у арганізацыі гэтай справы. "Простыя ступені да вяршынь вядуць!" – робіць ѐн вывад[9].

Узброены інтэлектуальнымі дабрачыннасцямі, у адпаведнасці з канкрэтнымі абставінамі, чалавек можа сам вызначыць характар сваіх паводзін. Гусоўскі здолеў разглядзець, што некаторыя маральныя паняцці, нормы і законы вельмі відазменлівы. Яны вар'іруюцца ў залежнасці ад многіх прычын.

Так, напрыклад, паляванне як крыніца існавання або сродак падрыхтоўкі воінаў выклікае ў яго станоўчую маральную ацэнку, але забаўляльныя ловы раз'юшаных звяроў, калі "радзі пацехі" гінуць людзі, ѐн гнеўна асуджае. Знешне смелы ўчынак не заўсѐды можна аднесці да храбрасці. Пачуццѐ жалю і не болей можа выклікаць выхадка юнака, які "толькі з жадання каханай прыйсціся пад нораў зробіць свой рыцарскі выбрык – і тут жа загіне" (109).

Наогул, у жыцці не заўсѐды можна проста адрозніць маральнае ад амаральнага. "Рашаць, што добра, а што не, справа наўрад ці майго розуму, толькі абшчына шляхі асвячае"[10]. Але нават і калектыўная думка, бывае, не знаходзіць ісціну, бо "праўда заўсѐды ў глыбінях" (79). Апісваючы жудасныя сцэны экзекуцыі "ведзьмакоў-грахаводнікаў", паэт сумняваецца ў правамернасці такіх дзеянняў. Ён піша, што людзі "вобмацкам праўду знаходзяць, а ў нашых павер'ях праўда яшчэ не абмацана, так мне здаецца" (78).

Бадай, самым характэрным, што адрознівала Гусоўскага ад многіх іншых беларускіх мысліцеляў, было выразнае акцэнтаванне ім "сувязі маральных дабрачыннасцей з натуральна-прыродным асяроддзем"[11]. Паэт, дзяцінства і юнацтва якога прайшлі ў лесе, высока адзываецца аб школе прыроды, што выхоўвае ў чалавеку чалавека. Яна для людзей – "элексір маладосці, бадзѐрасці духу" (77). Лес, фізічная праца, паляванне – выхаваўчыя сродкі, якія маюць большую гаючую сілу для душы і цела, чым любое лекавае зелле. Велізарны выхаваўчы патэнцыял тоіцца ў правільных адносінах чалавека да прыроды. Гусоўскі ўсхваляе "княжацкі ўказ" аб забароне палявання на самку і яе патомства, ганьбуе тых, хто губіць прыродныя багацці. У многім дзякуючы прыродзе ѐн прыходзіць да высновы аб уздзеянні прыгожага на выхаванне высокай духоўнасці. Пушча, дзе "асалода самаму сэрцу і воку", настолькі захапляе сваѐй прыгажосцю, што "тут адпачынак і дзейнасць спалучацца трапна" (73-74). Наогул, судакранаючыся з велічным, прыгожым, чалавек маральна ўдасканальваецца, узбагачаецца, таму Гусоўскі насуперак пратэстантам патрабуе рабіць "святыні ўсѐ прыгажэйшымі", бо "храма веліч імкнецца розум недасведчаных накіроваць"[12]. Парыванні паэта да прыгожага не могуць не ўражаць і сенняшняга чытача. І хто ведае, чаго тут больш: ці павеваў Адраджэння, ці крывѐю продкаў перайшоў шых адносін іх да "красного"? |

Гусоўскі высока цэніць сілу ўздзеяння ўсіх відаў мастацтва. "Гуслі і песні чаруюць, – пісаў ѐн, – і страшную сілу маюць"[13]. Каб маральна аздаравіць грамадства, асветнік прапануе выхаванне людзей пачынаць з маленства. Ён хоча, "каб дзіця прывыкала да прыгожага ў раннія гады"[14]. Варта адзначыць, што маральная накіраванасць, якая абумовіла істотныя рысы ідэйна-мастацкага зместу твораў Гусоўскага, заўсѐды неадлучна звязвае этычнае з эстэтычным. Прычым апошняе ў асноўным ставіцца на службу дасягнення маральных мэт.

Натуральна-прыроднае часта атаясамліваецца ў Гусоўскага з чалавечым. Назіральнае вока мастака прыкмячае, што ў прыродным асяроддзі многае ўладкавана, як і ў, людской супольнасці. Аднак ѐн перасцерагае, што механічны

перанос прыродных законаў на чалавечае грамадства не заўсѐды апраўданы. "І ў пушчах, і ўсюды на свеце моцныя гэтага свету за права на ўладу б'юцца на злом галавы, хоць кулачнае права, як і вяршынства жывѐльнаю грубаю сілай, – не згаджаецца гуманіст, – спрэчная справа" (67).

Як і ўсе рэнесансныя мысліцелі на шляху духоўна-этычных і сацыяльна-чалавечых пошукаў, Гусоўскі лічыў важным метадам маральнага выхавання славеснае ўздзеянне на розум і пачуцці чалавека. Асаблівую ўвагу ѐн удзяляе адбору матэрыялу, які выкарыстоўваецца пры ажыццяўленні гэтага метаду. Лепшым механізмам такога адбору з'яўляецца час, які пакідае ў грамадстве ўсѐ каштоўнае, выверанае векавым выхаваўчым вопытам народа. Таму асветнік павучае: "Варта нам захаваць павучанні продкаў блажэнных, каб душы тых, хто заблудзіўся, не захлынуліся ў злых норавах"[15].

Захоплены сілай слова, Гусоўскі параўноўвае паэтычнае пяро са стралой, пушчанай з лука воіна: "Дзіўнае ўсѐ ж падабенства: адзінае джала ў пѐраў і стрэл, а напоішь хоць злѐганьку ядам – хопіць і драпіны, каб закрануты загінуў" (57). З дапамогай слова можна прывесці да дабрачыннасці, а можна і да заган. Гусоўскі смуткуе, што бывае "...прывучаць нашчадкаў да небыліц веры падманнай"[16]. Той, хто валодае такой магутнай зброяй, не мае права сядзець без справы: "Сумленне і розум, і гонар уладна загадваюць кніжніку: як са званіцы бі ў сваѐ звонкае слова, узбройвай наводы..? (115).

Дасканалы даследчык чалавечага духу, Гусоўскі тонка разумеў магчымасці прымянення таго ці іншага метаду маральнага выхавання ў залежнасці ад абставін. Так, напрыклад, у паэме "Перамога над туркамі" ѐн паказвае, што ніякія красамоўствы не патрэбны апалчэнцам перад боем, калі тыя ўгледзеліся жудасных карцін здзекаў ворага над мірным насельніцтвам:

Гучныя словы прамоўцы нікога з сялян не натхнілі,
Грозна натоўп зіашумеў, хорам крычаць у радах:
„Слоўцаў прыгожых даволі! Калі мы пачнѐм выступленне?
Боль нашы сэрцы гняце, хай ѐн і сілу нам дасць"[17].

У другой жа сітуацыі, наадварот, „сілу і гарт прыдае слова свайго караля"[18].

У маральным выхаванні Гусоўскі належную ўвагу ўдзяляе прыкладу. Ён лічыць, што выхаванне павінна быць арганізавана так, "каб імѐны славутых, здзяйсняючых подзвіг, смяротных бадзѐрылі, нікчэмных вялі па дарозе велічы"[19]. Удала ўводзіў паэт у свае творы мастацкія вобразы-персанажы, якія служылі прыкладам асуджэння адмоўных чалавечых якасцей і звычак.

Адным з выхаваўчых метадаў у маральным станаўленні асобы асветнік лічыць заахвочванне і пакаранне. Амаральныя паводзіны, па Гусоўскаму, павінны ганьбавацца, высмейвацца і пры неабходнасці строга карацца. Умела карыстаўся гэтым метадам князь Вітаўт, які па заслугах узнагароджваў воінаў ці

сурова, але справядліва караў.

Складаная, супярэчлівая эпоха істотным чынам накладвала свае адбіткі на погляды паэта. Так, ѐн зусім не здолеў пера-адолець пастулат сярэдневяковай этыкі, якая тлумачыла людскія заганы існаваннем абстрактнага зла на зямлі. Гусоўскі спрабуе прымірыць такія маральныя якасці, як пакорлівасць і гордасць, аскетызм і жыццярадаснасць. У яго светапоглядзе можна вылучыць ідэі, навеяныя ўплывамі Захаду і Усходу, тэалогіі і гуманізму, старажытнасцю і ўжо блізкай эпохай Новага часу. Аднак істотным было тое, што паэт не адрываўся ад жыццѐвых рэалій. Пагэтаму этыка-гуманістычная канцэпцыя Міколы Гусоўскага мае ярка выражаны сацыяльны кірунак. Яна хоць і не знаходзіць магістральных шляхоў перабудовы грамадства, але намячае шэраг прагрэсіўных тэндэнцый духоўнага абнаўлення кожнай асобы і людской супольнасці ў цэлым. Бадай, галоўнейшай яе заслугай было ўсталяванне прымату агульначалавечых маральных каштоўнасцей і абазначэнне шляхоў іх дасягнення, многія з якіх не страцілі свайг значэння і па сѐнняшкі дзень.

---

[1] Гусоўскі М. Песня пра зубра: На лацінскай, беларускай, рускай мовах. Мн., 1980. С. 52. (У далешым спасылкі на цытаты з паэмы даюцца па гэтаму вы- данню з укаэаннем у тэксце ў дужках старонкі.)

[2] Парэцкі Я.І. Паэма Міколы Гусоўскага "Жыццѐ Іакінфа" // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства. Мн., 1974. Вып. 2. С. 180.

[3] Парэцкі Я.І. Паэма Міколы Гусоўскага "Жыццѐ Іакінфа". С. 159.

[4] Там жа. С.173.

[5] Там жа.

[6] Парзцкі Я. І. Невядомыя вершы Міколы Гусоўскага (1523-1533 гады) // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства. Мн., 1975. Вып. 3. С. 180.

[7] Там жа. С. 179.

[8] Порецкый Я. Ннколай Гусовскнй. Мн., 1984. С. 57.

[9] Парэцкі Я.І. Паэма Міколы Гусоўскага "Жыццѐ Іакінфа". С. 159.

[10] Тамжа. С. 177.

[11] Падокшын С.А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага. Мн., 1990. С. 138.

[12] Парэцкі Я. І. Паэма Міколы Гусоўскага "Жыццѐ Іакінфа". С. 179;

[13] Порецкий Я. Николай Гусовский. С. 49.

[14] Парэцкі Я. І. Паэма Міколы Гусоўскага "Жыццѐ Іакінфа". С. 74.

[15] Там жа. С. 181.

[16] Там жа. С. 174.

[17] Гусоўскі М. Перамога над туркамі / Пер. з лац. Ю. Свіркі і Я. Парэцкага // Полымя. 1990. №6. С.
149

[18] Тамжа.С. 148.

[19] Парэцкі Я.І. Паэма Міколы Гусоўскага "Жыццѐ Іакінфа". С. 79.